# Рецензии

# Рэцэнзіі

# Reviews

*Галуза И.* **Язэп Дроздович. Языковое и этнографическое наследие: архивные материалы.** Минск : Бел. наука, 2022. 677 с. (на белорус.).

*Галуза І.* **Язэп Драздовіч. Моўная і этнаграфічная спадчына: архіўныя матэрыялы.** Мінск : Бел. навука, 2022. 677 с.

*Galuza I.* **Jazep Drazdovich. Linguistic and ethnographic heritage: archival materials.** Minsk : Belaruskaja navuka, 2022. 677 p. Belarusian.

У беларускім мовазнаўстве ў апошні час набываюць актуальнасць металексікаграфічныя даследаванні, прысвечаныя тэарэтычнаму вывучэнню лексікаграфіі як слоўнікавай дзейнасці. Прыярытэтнымі задачамі пры гэтым з’яўляюцца аналітычны разгляд гісторыі лексікаграфіі і правядзенне інвентарызацыі нацыянальнай слоўнікавай прадукцыі з мэтай выяўлення вядучых лексікаграфічных тэорый і вызначэння традыцый беларускай нацыянальнай лексікаграфіі на іншаславянскім фоне.

Акрамя сістэматызацыі апублікаваных лексікаграфічных прац, надзвычай важнай і складанай часткай такой работы выступае ўпарадкаванне і выданне твораў, якія на сённяшні дзень захоўваюцца ў рукапісным выглядзе і маюць статус архіўных помнікаў. У Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі распачата выданне серыі прац падобнага кшталту. Так, у 2018 г. на базе архіўных матэрыялаў была падрыхтавана да друку і апублікавана каштоўная, раней не вядомая шырокаму колу даследчыкаў, лексікаграфічная крыніца «Расейска-беларускі слоўнік» А. В. Ярушэвіча, укладальнікам якой выступіла І. У. Галуза, а навуковым рэдактарам – В. М. Курцова. У 2022 г. тыя ж укладальнік і рэдактар прэзентавалі навуковай грамадскасці новую кнігу з разгорнутымі аўтарскімі каментарыямі – зборнік архіўнай спадчыны знакамітага беларускага этнографа пачатку ХХ ст. «Язэп Драздовіч. Моўная і этнаграфічная спадчына: архіўныя матэрыялы».

Гэта грунтоўнае аб’ёмнае выданне адкрывае дадатковыя грані надзвычай featuresнабаковай асобы слыннага беларускага адраджэнца Язэпа Нарцызавіча Драздовіча. Ён вядомы як гісторык, археолаг, этнограф, літаратар, астраном-аматар, мастак, скульптар. У манаграфіі І. Галузы Язэп Драздовіч паўстае перад чытачом чалавекам, які цікавіўся моўнымі пытаннямі, збіральнікам народных моўных скарбаў і даследчыкам, які імкнуўся спрыяць справе нармалізацыі беларускай літаратурнай мовы.

У склад кнігі ўвайшла ўся даступная на сёння лінгва-этнаграфічная спадчына Язэпа Драздовіча з архіваў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі і Бібліятэкі імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы. Выданне складаецца з 13 раздзелаў. Першыя 8 з іх уяўляюць сабой разнастайныя тэрміналагічныя, тэматычныя і агульнамоўныя лексічныя зборы: беларуска-рускі слоўнік тэрміналогіі па анатоміі і фізіялогіі цела чалавека, зборы слоў па тэмах «Батаніка і аграномія», «Геаграфія і геалогія», «Свойскія жывёлы», «Прылюдныя і адлюдныя характары людзей», «Хата і хатняе начынне», «Будоўля хаты. Хатняе начынне», «Астраномія», матэрыялы да краёвых слоўнікаў Дзісеншчыны і Піншчыны, а таксама да поўнага слоўніка беларускай мовы. У асобным раздзеле падаецца невялікі рэгіянальны батанічны слоўнік, падшыты да рукапісных матэрыялаў, які быў складзены У. Павалковічам на базе гаворкі вёскі Рымкі. Да гэтай працы, як можна меркаваць, Язэп Драздовіч меў пэўнае дачыненне (не выключана, што У. Павалковіч збіраў матэрыялы па яго

CC BY NC

просьбе, быў яго інфарматарам або суаўтарам). Прыведзены пералік дэманструе шырыню лінгвістычных інтарэсаў Язэпа Драздовіча, які не быў прафесійным філолагам, аднак усвядоміў неабходнасць занатоўваць дыялектныя і этнаграфічныя багацці раней за афіцыйнае аб'яўленне адпаведных навуковых ініцыятыў. Напрыклад, слоўнікавую тэрміналагічную працу ён пачаў у 1921 г., калі яшчэ не дзейнічала Навукова-тэрміналагічная камісія.

Каштоўнасць названых рукапісных крыніц, дзе зафіксавана значная колькасць элементаў, якія ўваходзяць у склад жывога народнага маўлення, не падлягае сумненню. У іх прадстаўлена рэгіянальнае лексічнае багацце, найперш лексемы, што прэзентуюць традыцыйную матэрыяльную і духоўную культуру, светапогляд, мараль, этыку, комплекс традыцыйнай працы і іншыя сферы жыцця народа. Сярод іх можна сустрэць цікавыя рэгіянальныя адзінкі (*багу́к* 'ежа, прыгатаваная з мяса', *галошчы́т* 'ледзяная корка на дарогах, дрэвах, стрэхах', *жо́вэнык* 'жоўты пясок', *закервашы́* 'манжэты', *ка́нька* 'балотнае акно', *лакно́* 'вадзяная лілія', *роска́ль* 'пачатак вясны, калі растае снег', *трыбратдзеці* 'траюрадныя браты і сёстры', *цы́піль* 'паўвостраў, створаны звілістай ракой' і інш.), якія дэманструюць рэгіянальную спецыфіку і адметнасць народнай моватворчасці. Варта адзначыць, што лексічныя матэрыялы Язэпа Драздовіча ў асноўным адбіраліся ў межах, як адзначае І. Галуза, «разумна пурыстычнага падыходу», гэта значыць рэестравая частка запісаў фарміравалася пераважна з аўтэнтычных самабытных беларускіх адзінак, а запазычанні адбіраліся ў асноўным з ліку даўніх і трывала адаптаваных беларускай мовай. Пры гэтым словазборы[1] Язэпа Драздовіча хутчэй з'яўляюцца поўнымі, а не дыферэнцыяльнымі і, адпаведна, дэманструюць не нейкі асобны фрагмент лексікі, пры выбары якога цяжка пазбегнуць суб'ектыўнасці, а адлюстроўваюць цэласную рэгіянальную лексічную сістэму.

Асаблівай увагі заслугоўваюць этнаграфічныя малюнкі (раздзел 9), на якіх дэталізаваныя прафесійна выкананыя выявы суправаджаюцца подпісамі з назвамі намаляваных аб'ектаў. Гэта надзвычай каштоўныя матэрыялы, якія, як указвае І. Галуза, фактычна адлюстроўваюць спробу стварэння «тлумачальнага слоўніка, у якім дэфініцыя заменена ілюстрацыяй».

Раздзелы 10 і 11 таксама прадстаўляюць вельмі арыгінальны, варты ўвагі лінгвістычны матэрыял: гукаперайманні, устойлівыя выразы (сабраныя на Дзісеншчыне), выклічнікі (сабраныя на Піншчыне). Тут чытач знойдзе адметныя парэміялагічныя адзінкі, афарызмы, народныя параўнанні (*Не бярэцца рыбка за далато; Вышэй пупа не падскочыш; Дудар ні гаспадар, а стралец не жылец; Бог вясёлых любіць; Ня ўвесь той сьвет, што ў вакне; Кароценькая як акамёлак; Рукі чорныя ад працы як аральля; Распух як ваган; Лысы як качан; Вясёлы як у райі*), арыгінальныя павер'і (*У пятніцу піяньня, а ў нядзелю сьнеданьня дарма ні мінаюць; Казельні у траве расчычыкаліся – на дождж*), праклёны (*Каб цябе воўк!*), скорагаворкі (*Авечычка с касмачком і падкасмачкам*), загадкі (*Сярод сіняга поля залаты сярпок – Маладзік*)[2].

У раздзеле 12 сабраны беларускія народныя песні, запісаныя Язэпам Драздовічам на тэрыторыі Дзісеншчыны і Піншчыны. Гэтыя творы маюць вялікую этнаграфічную і лінгвістычную значнасць, паколькі акумулююць звесткі пра абрадавыя і моўна-дыялектныя асаблівасці адпаведных рэгіёнаў.

Раздзел 13 змяшчае лісты Язэпа Драздовіча, адрасаваныя родным, сябрам, калегам, і некаторыя іншыя яго аўтографы. Іх публікацыя вельмі важная для беларускай гістарыяграфіі, паколькі перапіска з'яўляецца не толькі банкам асабістых даных, сведчаннем пэўных адносін паміж карэспандэнтамі, ілюстрацыяй індывідуальнай манеры пісьма аўтара, але і аўтарытэтнай гістарычнай крыніцай, жывым дакументам пэўнай эпохі.

Апублікаваныя ў кнізе матэрыялы сабраны ў двух беларускіх рэгіёнах: на Дзісеншчыне (радзіма Язэпа Драздовіча) і Піншчыне (сюды ён быў камандзіраваны ў 1926 г. Беларускім навуковым таварыствам у Вільні з мэтай збору этнаграфічных даных у рамках праграмы стварэння слоўніка жывой беларускай мовы). Цікава, што пры ўкладанні матэрыялаў, сабраных для слоўніка на Піншчыне, Язэп Драздовіч успрымаў асаблівасці добра вядомай яму дзісенскай гаворкі фактычна як нарматыўныя ўзоры і ў тлумачальнай частцы слоўнікавага артыкула рэгулярна выкарыстоўваў дзісенскія лексемы. Такім чынам, яму ўдалося стварыць арыгінальны двухдыялектны слоўнік.

Паколькі Язэп Драздовіч пры занатоўванні лексем імкнуўся захоўваць асаблівасці мясцовага вымаўлення, яго запісы прэзентуюць не толькі лексіка-семантычны аспект функцыянавання рэгіянальных слоў, але і ўтрымліваюць звесткі пра мясцовыя фанетыка-марфалагічныя асаблівасці адпаведных гаворак, адлюстроўваюць стан дыялектнага маўлення пэўнага перыяду. Такім чынам, яны маюць вялікае значэнне для гістарычнай дыялекталогіі. Акрамя таго, апрацаваныя дыялектныя матэрыялы могуць папоўніць дыялектны падкорпус Нацыянальнага корпуса беларускай мовы, а таксама электронную картатэку Зводнага слоўніка беларускіх народных гаворак, праца над якім у апошнія гады ідзе ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. У гэтым выданні якраз і плануецца аб'яднаць усе даступныя лексікаграфічныя, у тым

[1]У рэцэнзіі, як і ў рэцэнзуемым выданні, пры абазначэнні матэрыялаў слоўнікавага тыпу Язэпа Драздовіча ўжываецца лексема «словазбор».

[2]Цытаты прыводзяцца з захаваннем моўных асаблівасцей арыгінала.

ліку рукапісныя архіўныя, крыніцы. Паводле звестак І. Галузы, агульны аб'ём падрыхтаваных да друку матэрыялаў Язэпа Драздовіча ўтрымлівае больш за 18,5 тыс. дзісенскіх і пінскіх лексем, а таксама каля 1,7 тыс. устойлівых адзінак розных жанраў. Увядзенне ў навуковы зварот гэтых рарытэтных даных, доступ да якіх без апублікавання быў вельмі абмежаваным, – надзвычай важнае дасягненне беларускай дыялекталогіі і лексікаграфіі, паколькі ўпарадкаванне і сістэматызацыя дыялектных лексічных матэрыялаў з'яўляецца адной з прыярытэтных задач не толькі нацыянальнага мовазнаўства, але і славістыкі ўвогуле.

Апрацаваныя і выдадзеныя рукапісы маюць навуковую вартасць і ў галіне беларускага гістарычнага мовазнаўства. У прыватнасці, яны могуць служыць крыніцай пры вывучэнні гісторыі правапісу. У запісах Язэпа Драздовіча адлюстраваліся асаблівасці арфаграфічнай практыкі 1920-х гг., гэта значыць таго перыяду, калі адбывалася актыўнае фарміраванне моўных норм, адпаведна, іх аналіз можа спрыяць усведамленню спецыфікі тагачаснага беларускага нарматыўнага працэсу.

Матэрыялы Язэпа Драздовіча выклікаюць цікавасць у металексікаграфічным плане. Яны фактычна знаёмяць чытача з працай лексікографа на важным этапе станаўлення беларускай лексікаграфічнай традыцыі, дэманструюць унікальныя факты з гісторыі нацыянальнай лексікаграфіі. Па іх можна прасачыць, якія прынцыпы прымяняліся пры складанні рэестра словазбораў, якім чынам ажыццяўлялася арганізацыя ўнутранай структуры зборнікаў на макра-, мета- і мікраўзроўнях, датычных адпаведна спосабу сістэматызацыі лексем (строга алфавітны, гнездавы ці ідэаграфічны), сістэмы памет, адсылак і падобных элементаў і непасрэднага зместавага напаўнення слоўнікавага артыкула.

Публікацыя рукапіснай спадчыны Язэпа Драздовіча ва ўказаным аб'ёме з'яўляецца каштоўнай сама па сабе. Аднак кніга змяшчае яшчэ і значныя аглядна-аналітычныя фрагменты, прысвечаныя дакументальным матэрыялам. Непасрэднаму слоўнікаваму збору ў выданні папярэднічае разгорнуты нарыс-прадмова ўкладальніка слоўніка І. Галузы. Даследчыца прыводзіць біяграфічную інфармацыю, атрыбуцыю рукапісных крыніц, звесткі пра тое, якім чынам гэтыя крыніцы апрацоўваліся, падае цікавыя фотаілюстрацыі. Таксама І. Галуза аб'ектыўна ацэньвае асаблівасці рукапіснага архіва, апісвае цяжкасці сістэматызацыі, верыфікацыі і рэпрэзентацыі картатэчных матэрыялаў. Падрабязны каментарый суправаджае таксама кожны асобны раздзел кнігі. У выніку атрымаўся не проста добра апрацаваны ў фармальна-тэхнічных адносінах механічны збор рукапісных матэрыялаў, а грунтоўнае аналітычнае даследаванне манаграфічнага кшталту.

Вельмі карысным у рэцэнзуемай кнізе з'яўляецца зводны паказальнік лексем са словазбораў Язэпа Драздовіча (хоць як пэўную недапрацоўку можна адзначыць асобныя выпадкі памылковых спасылак, калі ў тэксце лексема адсутнічае на ўказанай у індэксе старонцы).

Падрыхтаваная І. Галузай праца характарызуецца грунтоўным падыходам да апрацоўкі рукапіснага матэрыялу. З аднаго боку, у выданні цалкам захавана не толькі аўтарская канцэпцыя падачы і запісу моўных адзінак, але і выпраўленні, закрэсліванні і іншыя пазнакі Язэпа Драздовіча. З другога боку, пры падрыхтоўцы рукапісу да выдання ўкладальніку давялося правесці і велізарную працу па апрацоўцы архіўнага матэрыялу з мэтай яго ўпарадкавання. Пры гэтым варта ўлічваць, што вялікая частка спадчыны Язэпа Драздовіча – гэта не рукапісы закончаных распрацовак, а чарнавікі. Згаданая акалічнасць істотна ўскладняла выдавецкую задачу, якая заключалася ў тым, каб захаваць рукапісную аўтэнтыку і зрабіць запісы даступнымі. Фактычна І. Галуза сама папрацавала як лексікограф, структуруючы рознага кшталту матэрыялы, прыводзячы іх, наколькі гэта было магчыма, у адпаведнасць з сучаснымі патрабаваннямі, узнаўляючы скарачэнні, паказваючы аўтарскія папраўкі, запаўняючы пэўныя лакуны, дадаючы ў межах разумнай дастатковасці прапушчаныя націскі, граматычныя паметы і проста расчытваючы рукапісны тэкст.

Вынікам гэтай найскладанейшай работы стаў надзвычай цікавы ў лінгвістычных адносінах дакумент, які да таго ж яскрава адлюстроўвае беларускую гісторыю вельмі важнага перыяду сумежжа XIX–XX стст. Кніга І. Галузы «Язэп Драздовіч. Моўная і этнаграфічная спадчына: архіўныя матэрыялы» – гэта ўдалая спроба вярнуць да жыцця тыя факты і даныя, што цэлае стагоддзе былі схаванымі ў архівах, а зараз, пасля адпаведнай апрацоўкі і сістэматызацыі, могуць прэтэндаваць на статус своеасаблівага пісьмовага помніка.

Матэрыялы падобнага зместу з'яўляюцца вельмі запатрабаванымі ў лінгвістыцы. Можна не сумнявацца, што публікацыя, якая робіць важкі ўнёсак у дыялекталогію, лексікалогію, лексікаграфію, тэрмінаграфію, этнаграфію, у вывучэнне гісторыі нацыянальнай навукі, знойдзе прыхільнікаў сярод спецыялістаў як у нашай краіне, так і ўвогуле ў славістычнай супольнасці.

***І. А. Гапоненка***[3]

[3]*Ирина Олеговна Гапоненко* – доктор филологических наук, профессор; профессор кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Ірына Алегаўна Гапоненка* – доктар філалагічных навук, прафесар; прафесар кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Iryna A. Gaponenko*, doctor of science (philology), full professor; professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *haponienka@bsu.by*